ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт

№ 16 (972) | АЎТОРАК, 30 лістапада 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На чарговым пасяджэнні Савета універсітэта, якое адбылося 25 лістапада, першым на парадку дня было разгледжана пытанне аб вылучэнні падручніка "Педагогіка" акадэміка НАН Беларусі І.Ф.Харламава на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Па інфармацыях дэканаў эканамічнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў Т.В.Карпей і Г.А.Сербіна абмеркаваны пытанні аб развіцці спецыялізацый на кафедрах эканомфака і адкрыцці на геолага-геаграфічным факультэце новай спецыялізацыі "Геалогія і пошук нафтавых і газавых месцанараджэнняў".

Па інфармацыі першага прарэктара М.В.Селькіна падведзены вынікі выканання мерапрыемстваў па ўхіленню недахопаў, якія былі выяўлены ў ходзе атэстацыі ГДУ.

Аб прадстаўленні да заахвочвання Саветам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнцкага навуковага аб'яднання — лабараторыі "Прыкладное і сістэмнае праграміраванне і новыя інфармацыйныя тэхналогіі" (навуковы кіраўнік начальнік ІВЦ М.С.Далінскі) праінфармаваў начальнік НДС В.Р.Сафонаў.

На Савеце па конкурсу абраны на замяшчэнне вакантных пасад загадчыкаў кафедр: усеагульнай гісторыі — дацэнт А.М.Бабкоў, рускай літаратуры — дацэнт Л.Л.Ермакова, французскай мовы — дацэнт С.М.Калацэй, радыёфізікі і электронікі — дацэнт С.В.Шалупаеў, грамадзянска-прававых дысцыплін — ст.выкладчык С.Г.Шулейка.

На Савеце разгледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## РАСЦЕ НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

На міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая праходзіла нядаўна ў Гомельскім тэхнічным універсітэце імя П.Сухога, групе вучоных вобласці былі ўручаны Дыпломы Беларускай акадэміі сацыяльных навук (БелАСН), сапраўднымі членамі якой яны абраны за поспехі ў прафесійнай дзейнасці.

Сярод тых, хто атрымаў такі дыплом, чатыры вучоныя з нашага універсітэта. Гэта загадчыкі кафедр — філасофіі; рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства адпаведна дактары філасофскіх і філалагічных навук У.М.Калмыкоў, У.І.Коваль, доктар філалагічных навук А.Ф.Рогалеў, а таксама дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі дзяржавы і права В.А.Трухаў.

***

Рашэннем Прэзідыума Беларускай горнай акадэміі прысвоена званне члена-карэспандэнта названай акадэміі дэкану геолага-геаграфічнага факультэта дацэнту Г.А.Сербіну. Яму ўручаны адпаведны дыплом.

Конкурсы

## ЗАЗІРНУЛІ Ў ВЕК НАСТУПНЫ

Як ніколі раней, больш працяглым атрымаўся сёлета конкурсны марафон пад назвай "Ану, першакурснік-99!". Змяніліся ўмовы правядзення конкурсу, і ён праходзіў у два этапы. Спачатку каманды маладых талентаў з усіх факультэтаў сустрэліся ў паўфінале, які вызначыў пяць лепшых з іх. А ў нядзелю, 21 лістапада, будучыя гісторыкі, матэматыкі, фізікі, біёлагі і юрысты зноў выйшлі на сцэну актавай залы ГДУ, каб журы вынесла канчатковы вердыкт: хто з фіналістаў зойме прызавыя месцы.

Тэма, якая была вызначана камандам для падрыхтоўкі конкурснай праграмы, гучала так: "Што век наступны нам рыхтуе?". Лёгкай яе адназначна не назавеш, і першакурснікам неабходна было нямала папрацаваць над яе ўвасабленнем на сцэне.

Пяць самых розных версій, у якіх "разглядаўся" XXI век, убачылі гледачы ў фінальнай сустрэчы каманд. Нібыта прыадчынілі яны дзверы ў будучыню і зазірнулі туды з цікаўнасцю.

Шматабяцаючым быў пачатак конкурснай праграмы ў гісторыкаў: век камп'ютэрызацыі паўстаў перад складанай праблемай — збою ў камп'ютэрных сістэмах, звязаным з двума нулямі. Захапляльна, відовішчна ішло ўсё напачатку. Але давесці так праграму да канца гісторыкам, на жаль, не ўдалося.

Дзве спрадвечныя процілегласці — Дабро і Зло (белае і чорнае) вялі барацьбу ў праграме першакурснікаў фізічнага факультэта. Былі і ў іх цікавыя моманты, знаходкі, вартыя ўвагі. Дабро павінна заўсёды перамагаць, і без яго пераступіць у век наступны людзям нельга — такую думку хацелася падкрэсліць будучым фізікам.

Сваё бачанне новага веку першакурснікі матфака звязалі з успамінамі аб мінулым і з яго самымі лепшымі ўласцівасцямі.

Будучыня — у нашых дзецях — такім уяўляецца новы век біёлагам. Іх праграма выйгравала ад наяўнасці добрых сольных нумароў.

Першакурснікі-юрысты пакарылі залу літаральна з першых мінут на сцэне. Відавочнымі былі выдатная кампазіцыя праграмы, ігра акцёраў, сама ідэя спектакля. У тым, што менавіта яны стануць пераможцамі, пасля заканчэння іх выступлення не сумняваўся ніхто з гледачоў.

Так і атрымалася. Пераходны прыз конкурсу члены журы аднадушна прысудзілі юрыстам. Біёлагі занялі другое месца, трэцяе — матэматыкі, чацвёртае падзялілі гісторыкі і фізікі.

Дзякуючы прафкому студэнтаў, спонсарам — аддзелу па справах моладзі гарвыканкома, вытворча-камерцыйнай фірме "Рата", Партыі народнай згоды — пераможцы, лепшыя выканаўцы конкурсу атрымалі прызы, падарункі, запрашэнні на дыскатэку "Лайт", на асенні баль у Дом настаўніка.

**Т.ДУБЯК.**



ПЕРАМОЖЦЫ!.. Фота У.ЧЫСЦІКА.

## АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СЛАВЯНСКАЙ ФРАЗЕАЛОГІІ

Пад такой назвай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскім дзяржуніверсітэтам імя Ф.Скарыны, Таварыствам Кірылы Тураўскага, абласной спецыялізаванай славянскай бібліятэкай нядаўна была праведзена Міжнародная навуковая канферэнцыя. У ёй прынялі ўдзел вучоныя з Расіі, Украіны, Беларусі, якія актыўна працуюць па гэтай лінгвістычнай дысцыпліне.

У грамадска-культурным цэнтры адбылося ўрачыстае адкрыццё канферэнцыі, у час якога выступілі Прэзідэнт Таварыства Кірылы Тураўскага, старшыня абласнога Савета дэпутатаў, кандыдат эканамічных навук В.С.Сяліцкі, доктар тэхнічных навук, прафесар, прарэктар па навуковай рабоце ГДУ Д.Р.Лін, к.ф.н., дацэнт, прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў. Там жа прайшло і пленарнае пасяджэнне, на якім было заслухана і абмеркавана 5 навуковых дакладаў.

Работа канферэнцыі працягвалася на філалагічным факультэце ГДУ, дзе працавалі дзве секцыі — "Славянская фразеалогія ў параўнальным, параўнальна-гістарычным і этнакультурным аспектах", "Славянская фразеалогія ў стылістычным і граматычным аспектах". Расійскія, беларускія і ўкраінскія вучоныя ў сваіх дакладах усебакова асвятлялі розныя напрамкі сваіх даследаванняў у галіне важнага раздзела мовазнаўства.

Цікавымі былі выступленні на канферэнцыі выкладчыкаў філалагічнага факультэта нашага універсітэта. Фразеалогія ў той ці іншай ступені стала прадметам даследавання дактароў філалагічных навук У.В.Анічэнкі, Р.М.Казловай, У.Ф.Рогалева, А.А.Станкевіч, У.І.Коваля, а таксама маладых вучоных.

Да дня юрыдычнага факультэта

## Традыцыі пашыраюцца

Адным з самых маладых у нашым універсітэце з'яўляецца юрыдычны факультэт. Самастойным ён стаў з 1-га чэрвеня 1998 года, а падрыхтоўка спецыялістаў-правазнаўцаў вядзецца ў ГДУ з верасня 1991 г. У гэтым годзе ўпершыню будзе святкаваць дзень факультэта.

Дарэчы, наш факультэт сур'ёзна і рупліва ставіцца да выпрацоўкі і захавання прыватных традыцый. Да свята плануецца правесці шэраг сустрэч з работнікамі праваахоўных органаў, урачыстую канферэнцыю, святочны канцэрт і іншыя мерапрыемствы.

Юрыдычны факультэт рыхтуе спецыялістаў-правазнаўцаў. Прадметам прафесіі юрыста з'яўляецца права. Права — гэта рэгулятар грамадскіх адносін, сродак забеспячэння парадку і стабільнасці. Гэта патрабуе ад юрыста асаблівых дадзеных: вялікай адказнасці і кампетэнтнасці. Юрысты ажыццяўляюць вельмі важныя функцыі ў дзяржаве і грамадстве: абараняюць законнасць і правапарадак, стаяць на варце справядлівасці, вядуць барацьбу са злачыннасцю і г.д. На наш дзень, у час прававой рэформы і імкнення Беларусі да прававой дзяржавы гэтая роля набывае яшчэ большае значэнне. Юрысты — гэта суддзі, пракуроры, адвакаты, натарыусы і інш.

Зараз наш факультэт дасягнуў вельмі добрых паказчыкаў і ўпэўнена можа паспрачацца з іншымі вучэбнымі ўстановамі юрыдычнага профілю.

На юрыдычным факультэце створаны тры кафедры: "Крымінальнага права і працэсу", "Тэорыі і гісторыі дзяржавы і права", "Грамадзянска-прававых дысцыплін". На кафедрах працуюць 37 выкладчыкаў, з іх — 5 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Сёння ў нас на дзённай форме вучыцца 460 студэнтаў. Для таго, каб найбольш дэталёва і поўна асвоіць пэўны напрамак навукі, на факультэце створаны тры спецыялізацыі: дзяржаўна-прававая, гаспадарча-прававая і судова-пракурорска-следчая.

На факультэце створаны належныя ўмовы для навучальнага і выхаваўчага працэсу. Маецца добры выкладчыцкі састаў: гэта сапраўдныя майстры сваёй справы, што ставяцца да працы добрасумленна і з адказнасцю. Многія з іх маюць багаты вопыт работы па юрыдычнай спецыяльнасці, што вельмі цэніцца студэнтамі, а маладыя выкладчыкі многае кампенсуюць энергіяй і ведамі. Акрамя сваіх да працэсу прыцягваюцца выкладчыкі з эканамічнага, псіхалагічнага і іншых факультэтаў, а таксама практычныя работнікі праваахоўных органаў. Да паслуг студэнтаў бібліятэка, кабінет прававой інфармацыі, наладжваецца сістэма карыстання сеткай INTERNET, ладзіцца кабінет крыміналістыкі.

На факультэце праводзяцца навукова-практычныя канферэнцыі. У гэтым годзе такая студэнцкая канферэнцыя была прысвечана правам чалавека. Нашы студэнты выступалі з дакладамі на рэспубліканскай канферэнцыі ў Брэсце і на міжнароднай — у Варшаве.

Безумоўна, у маладога факультэта маецца цэлы шэраг праблем. У іх ліку і тое, што ў выніку прававой рэформы трэба абнаўляць бібліятэку літаратурай аб новым заканадаўстве, падручнікамі, востра стаіць пытанне аб размеркаванні выпускнікоў. Ёсць праблемы ў тэхнічным забеспячэнні кабінета крыміналістыкі.

Факультэт, пераадольваючы ўсе цяжкасці, мае цвёрдую мэту надзяліць студэнтаў комплексам ведаў і высокім узроўнем прававой культуры. Ён упэўнена ўзяў курс на дасягненне агульнаеўрапейскіх стандартаў юрыдычнай адукацыі і падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў, здольных унесці належны ўклад у развіццё прававой дзяржавы.

**С.МІСАЧЭНКА,**
**студэнт гр.П-32 юрыдычнага факультэта.**

## РАСПРАЦОЎВАЮЦЬ МАЛАДЫЯ НАВУКОЎЦЫ

У г.Санкт-Пецярбургу адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя маладых вучоных і спецыялістаў "Оптыка-99". У ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі краін блізкага і далёкага замежжа — Расіі, Беларусі, Украіны, Арменіі, Эстоніі,Чэхіі, Румыніі, Кітая, ФРГ, Італіі, ЗША.

У гэтай галіне фізікі актыўна працуюць маладыя вучоныя нашага універсітэта. На канферэнцыі ГДУ прадстаўлялі аспіранты і супрацоўнікі фізічнага факультэта Ю.Нікіцюк, І.Каморнікаў, М.Аляшкевіч, а таксама І.Барсукоў з біяфака. Яны ўдзельнічалі ў рабоце секцыі "Аптычныя матэрыялы і тэхналогіі".

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў інфармацыйна-вылічальнага цэнтра горача віншуюць начальніка ІВЦ **ДАЛІНСКАГА** Міхаіла Сямёнавіча з прысваеннем яму БелВАКам вучонага звання дацэнт.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат геолага-геаграфічнага факультэта, калектыў кафедры экалогіі горача віншуюць загадчыка кафедры **КУСЯНКОВА** Аляксандра Мікалаевіча з прысваеннем яму БелВАКам вучонага звання дацэнт.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў геолага-геаграфічнага факультэта горача віншуюць малодшага навуковага супрацоўніка НДС **ГАЛКІНА** Аляксандра Мікалаевіча з паспяховай абаронай у МДУ імя М.В.Ламаносава дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата геолага-мінералагічных навук.

# ЗА САЦЫЯЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ

## павінны сёння больш актыўна выступаць прафсаюзы

**Фінансава-эканамічны крызіс у краіне закрануў практычна ўсе слаі насельніцтва. На сённяшні дзень мы фактычна з'яўляемся мільянерамі, а на самой справе на надзённыя нашы патрэбы грошай ледзь хапае.**

**У нялёгкім матэрыяльным становішчы апынуліся таксама работнікі адукацыі і навукі, студэнцкая моладзь. Прыкметна зніжаецца сярэдні ўзровень аплаты працы ў галіне адукацыі ў параўнанні з яе паказчыкамі ў прамысловасці. Варта ўспомніць вядомы выраз: "Хотя образование стоит недешево, но невежество в конечном счете обходится еще дороже". Атрымліваецца, што эканоміць на адукацыі не толькі не даравальна, а нават амаральна.**

**Хто сёння можа адстаяць наша права на дастойнае чалавечае жыццё, акрамя нас саміх? У рамках дзеючага заканадаўства гэтым займаюцца прафсаюзы, якія ў неспрыяльных умовах робяць усё магчымае, каб падтрымаць узровень сацыяльных гарантый у сістэме адукацыі. У сённяшніх умовах яны асабліва павінны быць арганізаванымі, згуртаванымі, каб здолець па-сапраўднаму абараняць сацыяльна-эканамічныя інтарэсы работнікаў сферы.**

**Аб гэтым ішла гаворка на справаздачна-выбарных прафсаюзных канферэнцыях студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, якія прайшлі ва універсітэце адпаведна 26 кастрычніка і 17 лістапада г.г. Прафсаюзныя камітэты рабілі справаздачу з красавіка 1997 г. па кастрычнік 1999 г. і з кастрычніка 1994 г. па лістапад 1999 г.**

Студэнцкая прафсаюзная арганізацыя ГДУ, якая ўваходзіць у склад галіновага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі і ў Асацыяцыю студэнцкіх прафсаюзных арганізацый Беларусі, налічвае ў сваіх радах 4824 члены. Як зазначыла ў дакладзе XV справаздачна-выбарнай канферэнцыі старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава, адным з галоўных напрамкаў дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі з'яўляецца сацыяльная абарона сваіх членаў. Гэтаму садзейнічае Пагадненне, якое заключана паміж адміністрацыяй (рэктаратам) і калектывам студэнтаў. Яно закранае асноўныя сферы жыццядзейнасці студэнтаў: вучэбна-вытворчую, матэрыяльнае забеспячэнне, вучэбную і працоўную дысцыпліну, ахову працы і аздараўлення, жыллёва-бытавыя праблемы, культурную і спартыўна-масавую работу. Студэнты–члены прафкома прымаюць удзел у рабоце рэктарата, Савета ГДУ, саветаў факультэтаў, універсітэцкіх камісій, якія закранаюць інтарэсы моладзі, удзельнічаюць у распрацоўцы нарматыўных дакументаў.

Многія пункты Пагаднення накіраваны на паляпшэнне ўмоў падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Ва ўмовах наяўнасці беспрацоўя вельмі важна, каб выпускнікі вну атрымалі права першага рабочага месца.

Яшчэ адзін аспект работы прафкома – стварэнне здаровых і бяспечных умоў вучобы, быту, аздараўлення. Студэнтам выдзяляюцца пуцёўкі на аздараўленне ў санаторыі рэспублікі і вобласці, шырока выкарыстоўваецца і ўласная лячэбная ўстанова – санаторый-прафілакторый. Але многае залежыць і ад саміх студэнтаў. А яны, на жаль, як адзначалася на канферэнцыі, не заўсёды самі клапоцяцца аб сваім здароўі: не праходзяць своечасова медыцынскі агляд, не пазбаўляюцца многіх дрэнных звычак і інш.

Ва ўмовах адсутнасці фінансавання падтрыманне матэрыяльнай базы з'яўляецца найбольш хвалюючым пытаннем. Не заўсёды своечасова рыхтуюцца да новага навучальнага года і ацяпляльнага сезона карпусы і інтэрнаты універсітэта, не ў належным стане знаходзяцца асобныя вучэбныя аўдыторыі, лабараторыі. Шмат ёсць у чым зрабіць папрок самім студэнтам, якія не навучыліся нармальным паводзінам, не захоўваюць чысціню і парадак у аўдыторыях, дзе займаюцца, у месцах агульнага карыстання, у інтэрнатах. Гэта паказчык узроўню іх культуры, павышаць які ў пэўнай ступені абавязаны і аддзел па выхаваўчай рабоце, аб чым гаварылася на канферэнцыі.

Не здымаецца з прафсаюзнага камітэта і адказнасць за правядзенне культурнай і спартыўна-масавай работы. На гэта ім выдзяляюцца немалыя матэрыяльныя сродкі.

У ходзе справаздачна-выбарнай кампаніі студэнты ўздымалі пытанні слабай матэрыяльнай базы універсітэта, яе ўтрымання, базы для правядзення вучэбных практык, у прыватнасці, біёлагаў, гучалі нараканні на работу прадпрыемстваў грамадскага харчавання універсітэта, парушэнне касай ГДУ графіку выплаты стыпендыі, што стварала нярвовую абстаноўку для стараст акадэмічных груп. Вострым застаецца таксама пытанне аб перанасяленні ў студэнцкіх інтэрнатах, прагучала крытыка і ў адрас культурнага цэнтра: рамкі правядзення конкурсу "Ану, першакурснік!" сёлета расцягнуліся аж да лістапада, што адняло шмат часу ад вучэбных заняткаў многіх яго ўдзельнікаў, былі таксама недапрацоўкі ў рабоце журы ў час паўфіналу гэтага конкурсу. Не ўсім студэнтам па кішэні і білеты на яго.

Удзельнікі канферэнцыі прызналі работу прафкома студэнтаў за справаздачны перыяд здавальняючай, прынялі рэзалюцыю, накіраваную на ўдасканаленне стылю і метадаў работы прафсаюзнай арганізацыі, выбралі новы састаў прафкома, рэвізійнай камісіі, якую ўзначаліла студэнтка 2-га курса эканомфака А.Лабасава, дэлегатаў на абласную прафсаюзную канферэнцыю, III з'езд работнікаў адукацыі і навукі.

### САСТАЎ ПРАФКОМА СТУДЭНТАЎ

*Вучэбна-выхаваўчая камісія*

**КОЛТЫШАВА Н.І**. — старшыня.

**КУКСА** Мікалай, студэнт 2-га курса юрыдычнага факультэта.

**ПІШЧЫКАВА** Марына, студэнтка 1-га курса геолага-геаграфічнага факультэта.

**КІСЕЛЬ** Вольга, студэнтка 3-га курса факультэта псіхалогіі.

**ШЫШКОВА** Алена, студэнтка 1-га курса гістарычнага факультэта.

*Камісія па сацыяльнаму страхаванню*

**КОЛТЫШАВА Н.І**. — старшыня.

**ІГНАЦЕНКА** Вольга, студэнтка 3-га курса фізічнага факультэта.

**ГАЙКОВА** Таццяна, студэнтка 2-га курса фізічнага факультэта.

*Спартыўна-аздараўленчая камісія*

**ЛАРЧАНКА** Юлія — старшыня, студэнтка 4-га курса факультэта фізічнай культуры.

**ПЯХОТА** Раман, студэнт 3-га курса біялагічнага факультэта.

**СТАХОЎСКАЯ** Вольга, студэнтка 4-га курса факультэта фізічнай культуры.

**АДЗІНЦОВА** Марыя, студэнтка 4-га курса факультэта замежных моў.

*Культурна-масавая камісія*

**ПУСТАВАРАВА** Кацярына — старшыня, студэнтка 2-га курса філалагічнага факультэта.

**МАШКЕТАВА** Алена, студэнтка 2-га курса філалагічнага факультэта.

**ВОЛКАЎ** Андрэй, студэнт 2-га курса факультэта замежных моў.

**БЫКОЎСКІ** Валерый, студэнт 3-га курса біялагічнага факультэта.

*Камісія па кантролю за грамадскім харчаваннем*

**МАСЛАВА** Таццяна — старшыня, студэнтка 3-га курса матэматычнага факультэта.

**ПРЫЦЬКО** Нэлі, студэнтка 3-га курса эканамічнага факультэта.

**МІСАЧЭНКА** Сяргей, студэнт 3-га курса юрыдычнага факультэта.

**КУЗЬМЯНКОВА** Таццяна, студэнтка 2-га курса геолага-геаграфічнага факультэта.

*Жыллёва-бытавая камісія*

**МАСЛАВА** Таццяна — старшыня, студэнтка 3-га курса матэматычнага факультэта.

**КАНДРАЦЕНКА** Марына, студэнтка 2-га курса гістарычнага факультэта.

**МАРТЫНАЎ** Юрый, студэнт 2-га курса матэматычнага факультэта.

* * *

Пяць гадоў прайшло з часу правядзення апошняй справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. За гэты час у нашым жыцці адбыліся змены – жыццёвы ўзровень работнікаў сферы адукацыі і навукі знізіўся, можна сказаць, да крытычнай адзнакі. Таму, зразумела, і задачы, якія стаяць сёння перад галоўным нашым абаронцам – прафсаюзам, сталі больш вострымі, патрабуючымі неадкладнага вырашэння – забяспечыць дастойна аплачваемую працу, рэальную магчымасць кожнаму вучыцца і працаваць, жыць з годнасцю. Сёння прафсаюзы як ніколі раней павінны займаць больш цвёрдую пазіцыю ў адстойванні законных правоў і інтарэсаў працоўнага чалавека.

Аб гэтым гаварыў у справаздачным дакладзе на канферэнцыі старшыня прафкома ГДУ Г.І.Варатніцкі. Ён падрабязна ахарактарызаваў усе аспекты дзейнасці прафсаюзнага камітэта, адзначыў яго зладжанасць, дакладнасць работы ўсіх яго членаў. Пастаянна аказвалася кансультацыйная дапамога работнікам універсітэта, своечасова разглядаліся іх просьбы, прапановы, заявы. Для вырашэння пытанняў абароны інтарэсаў членаў універсітэцкага калектыву прафкомам і рэктаратам была абрана форма Калектыўнага дагавора, які рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж наймальнікам і работнікам. Калектыўны дагавор забяспечвае выкладчыкам і супрацоўнікам многія пазітыўныя змены ў іх працы, бытавой сферы, аказвае сацыяльную падтрымку працуючым і ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і працы.

У сённяшні цяжкі час вельмі важнай у дзейнасці прафкома з'яўляецца матэрыяльная падтрымка супрацоўнікаў. На сённяшні дзень усе жадаючыя набылі з дапамогай прафкома зямельныя надзелы, што дазволіла многім пераадольваць матэрыяльныя цяжкасці.

Належная ўвага надзяляецца аздараўленню выкладчыкаў, супрацоўнікаў і іх дзяцей. Хаця ўжо трэці год ва універсітэце працуе створаная камісія па аздараўленню, асноўную работу па збору заяў, медыцынскіх даведак, складанні заявак на пуцёўкі і г.д. выконвае прафсаюзны камітэт.

Аднак, як адзначалася ў справаздачным дакладзе, з-за недахопу фінансавання не ўсе надзённыя і хвалюючыя пытанні вырашаюцца.

Дапоўнілі дакладчыка выступіўшыя ў спрэчках дэкан фізічнага факультэта С.В.Шалупаеў, работніца АГЧ Д.М.Кудловіч, дацэнт кафедры філасофіі Т.П.Гараніна, старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава, старшыня Савета ветэранаў вайны і працы А.А.Косцікаў. Яны далі станоўчую ацэнку рабоце прафкома за справаздачны перыяд, унеслі прапанову прызнаць яе здавальняючай. Асобна варта сказаць пра выступленне прафгрупорга кафедры фізічнага выхавання і спорту Т.К.Канавалавай, якая ў верасні г.г. прымала ўдзел у рэспубліканскай нарадзе прафгрупоргаў "Аб сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, ходзе выканання сацыяльна-эканамічных патрабаванняў і прапаноў прафсаюзаў і іх далейшых дзеяннях". На ёй асноўнай была думка: у салідарнасці, у аб'яднанні наша сіла, моцныя прафсаюзы небяспечныя для ўлады, асабліва ў час крызісу. Дэлегацыя ад ГДУ прымала таксама ўдзел у мітынгу, які праходзіў на стадыёне "Прамень" і аднагалосна прыняла рэзалюцыю аб поўнай падтрымцы справядлівых патрабаванняў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі спыніць збяднenne працоўных, змяніць сацыяльна-эканамічную палітыку.

Сугучным было выступленне на канферэнцыі і старшыні абласнога камітэта галіновага прафсаюза У.Я.Курылава, які выказаў пажаданне, каб члены прафсаюза больш актыўна падтрымлівалі акцыі прафсаюзаў па абароне законных правоў працоўнага чалавека.

На канферэнцыі прынялі ўдзел і выступілі рэктар універсітэта Л.А.Шамяткоў і першы прарэктар М.В.Селькін. Прафсаюзная арганізацыя і прафком, зазначылі яны, з'яўляюцца добрымі памочнікамі рэктарата ў паспяховай рэалізацыі ўсіх пытанняў. Што ж датычыць некаторых нявырашаных праблем, гэта тлумачыцца аб'ектыўнай прычынай – недастатковым фінансаваннем.

На канферэнцыі заслухана справаздача рэвізійнай камісіі, выбраны яе новы састаў (старшыня – ст.выкладчыца кафедры бухуліку і АГД Т.У.Ушак), састаў прафкома, прынята адпаведная рэзалюцыя. На пасаду старшыні прафсаюзнага камітэта універсітэта была вылучана адна кандыдатура – Г.І.Варатніцкага, за якога аднагалосна і прагаласавалі дэлегаты канферэнцыі.

**Т. ДУБЯК.**

### САСТАЎ ПРАФКОМА УНІВЕРСІТЭТА

*Камісія грамадскага кантролю за захаваннем заканадаўства аб працы*

**РЫБАЛЬЧАНКА А.Р**. – старшыня камісіі, дацэнт кафедры batанікі і фізіялогіі раслін.

**ВАЙЦІШКІНА А.Л.** – ст. выкладчык кафедры камерцыйнай дзейнасці і фінансаў.

**ЕМЯЛЬЯНАЎ С.Л**. – асістэнт кафедры крымінальнага права і працэсу.

**КУЗНЯЦОВА Т.А**. – выкладчыца факультэта замежных моў.

*Жыллёва-бытавая камісія*

**ФЯДОСЕНКА М.М.** – старшыня камісіі, дацэнт кафедры оптыкі.

**ДАРАФЕЕВА А.А**. – асістэнт кафедры рускай літаратуры.

**ВІШАНКОВА А.А.** – вядучы інжынер ІВЦ.

**КАРМАЗІН А.П.** – прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях.

*Арганізацыйна-масавая камісія*

**МЯРЭЖА В.Л.** – старшыня камісіі, дацэнт кафедры МПК.

**ДОБШЫКАВА Т.Р.** – бібліятэкар.

**КОЎЗІК Н.А.** – асістэнт кафедры экалогіі.

**КОСЦІКАЎ А.А.** – старшыня Савета ветэранаў вайны і працы.

*Культурна-масавая і спартыўна-масавая камісія*

**ЛІСОЎСКІ В.В.** – старшыня камісіі, дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту.

**МАЛКОВА Н.В.** – камендант вучэбнага корпуса № 5.

**ПЯТРУК Т.М.** – галоўны бухгалтар сталовай.

**ГІЛЬ Б.М.** – старшыня спортклуба.

*Камісія па ахове працы і ТБ*

**СЕМЯНКОЎ А.М.** – старшыня камісіі, заг. лабараторыямі біяфака.

**ЕЛІСЕЕВА І.М**. – загадчыца кафедры давузаўскай падрыхтоўкі.

**ДУБЯК Т.М.** – карэспандэнт газеты "Гомельскі універсітэт".

**КРУКОЎСКІ В.П.** –ст.выкладчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры і спорту.

*Камісія па сацыяльнай абароне*

**ВАРАТНІЦКІ Г.І.** – старшыня.

**ВАЛЧКОВА Т.А.** – бухгалтар прафкома.

**АЗЯЎЧЫКАВА Г.У**. – нам. галоўнага бухгалтара.

**РАНІШЭНКА Р.Ф.** – медсястра санаторыя-прафілакторыя.

**ЯШЧАНКА А.Р.** – асістэнт кафедры гісторыі Беларусі.

# СКАРБНІЦА ВЕДАЎ ПРА СКАРЫНУ



**У канцы лістапада 1988 г. Савет Міністраў БССР прысвоіў нашаму універсітэту імя ўсходнеславянскага першадрукара, выдатнага вучонага і асветніка Ф.Скарыны. А ў маі 1993г. адкрыўся музей-лабараторыя Скарыны. Тут сабраны сотні твораў беларускага выяўленчага мастацтва, навуковых кніг, артыкулаў і манаграфій самога Скарыны (факсімільнае выданне пражскіх кніг) і пра яго, друкаваных прац выкладчыкаў і супрацоўнікаў, успаміны былых і цяперашніх супрацоўнікаў універсітэта і іх унукаў, ксеракопіі і газетныя публікацыі дакументаў пра важнейшыя падзеі ў гісторыі універсітэта, графічныя партрэты былых яго рэктараў і буйных вучоных.**

З найбольш каштоўных і цікавых матэрыялаў варта вылучыць арыгінал карціны Пятра Сергіевіча "Скарына ў друкарні" (яна перададзена музею-лабараторыі Саюзам пісьменнікаў Беларусі), драўляную скульптуру "Скарына" Ю.А.Платонава, фотаздымак выпускнікоў фізіка-матэматычнага факультэта пединстытута 1932-1936 гг., ксеракопіі скарыназнаўчых артыкулаў. Ёсць некаторыя часопісы, надрукаваныя за межамі СССР у 1920-1970 гадах; паэма "Калумбы" Я.Юхнаўца, выдадзеная ў Нью-Йорку ў 1967г.; артыкулы: з "Касцёльнай энцыклапедыі" (Варшава, 1902г.) і з "Падручнай касцёльнай энцыклапедыі" (Варшава, 1912г.); П.Крачэўскага "Скарына і незалежнасць", напісаны ім у 1925г. і апублікаваны ў 1926г. у зборніку "Замежная Беларусь" (Прага, 1926г.); з пражскага часопіса "Іскры Скарыны", што апублікаваны ў 1,3,4,5 нумарах за 1931, 1934 і 1935 гг.; чэшскага гісторыка-славіста А.В.Флароўскага "Новыя факты аб побыце Ф.Скарыны ў Празе", апублікаваны ў 1936 г. у пражскім "Часопісе народнага музея"; У.Глыбіннага "Залаты век" з літаратурнага часопіса "Пагоня", № 4, што выйшаў у лістападзе 1946г. у аўстрыйскім горадзе Зальцбург; Ю.Віцьбіча "Вялікі сын вялікага народа (Францішак Скарына)", надрукаваны ў восьмым нумары за 1949г. часопіса "Аб'яднанне" (Лондан); С.Брагі "Пачатак друкарства ў Беларусі" (№ 5 часопіса "Баявая ускалось", Канада, 1950г.); падборкі часопісаў "Наперад" (Англія, 1948-1949 гг.), "Моладзь" (Парыж, 1948-1953 гг., па 1-2 нумары); першая частка рамана М.Садковіча і Я.Львова "Георгій Скарына" (Мінск, 1946). Самы старэйшы артыкул пра Скарыну нашай калекцыі — праца з "Біблейскіх даследаванняў. Падарожжа па Расіі..." Е.Гендэрсана (Лондан, 1826).

Уся сабраная інфармацыя занесена ў навуковую картатэку, якая пастаянна папаўняецца.

Працай музея-лабараторыі кіруе савет, у склад якога ўваходзяць дактары філалагічных навук, прафесары У.Анічэнка, А.Станкевіч, І.Штэйнер, кандыдаты філалагічных навук М.Воінаў, Д.Паўлавец, А.Парукаў, кандыдат гістарычных навук В.Пічукоў і іншыя. Дарэчы, У.Анічэнка з'яўляецца галоўным і самым дасведчаным скарынаведам ГДУ. За працу ў гэтым напрамку ён узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі і медалём Францыска Скарыны.

За час існавання музея-лабараторыі праведзена 320 калектыўных і індывідуальных экскурсій, на якіх з жыццёвым і творчым шляхам Ф.Скарыны, гісторыяй універсітэта падрабязна пазнаёмілася 6 тысяч студэнтаў, школьнікаў, вучоных і грамадскіх дзеячаў. Сярод іх шмат наведвальнікаў з блізкага і далёкага замежжа: Расіі, Украіны, Кітая, Германіі, Францыі, Італіі, Англіі, ЗША, Польшчы. У прыватнасці, у час адкрыцця музея-лабараторыі госцем універсітэта быў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, патрыярхаў экзарх усёй Беларусі Філарэт. У свой час з экспанатамі азнаёміліся дэлегацыя Польскай акадэміі навук, старшыня Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта М.Р.Вайцянкоў і старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С.Сяліцкі, старшыня дзяржаўнага вышэйшага атэстацыйнага камітэта Беларусі А.П.Дастанка, намеснік старшыні ВАК Расіі М.Расолаў, дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку В.Кіпель, шмат кітайскіх, французскіх студэнтаў і інш.

У дзень святкавання 70-годдзя універсітэта ганаровым госцем музея-лабараторыі быў старшыня Палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А.А.Малафееў, які пакінуў у кнізе наведвальнікаў вельмі цёплыя словы.

З удзелам супрацоўнікаў музея-лабараторыі выпушчаны два хрэстаматыйныя зборнікі паэзіі пра беларускую мову. Даўно ўжо чакае свайго выпуску трэці — "Летапіс удзячнасці. Паэтычная скарыніяна", перакладзены на сучасную беларускую мову некаторыя асобныя выпускі скарынавых кніг. Пастаянна папаўняецца картатэка самага поўнага бібліяграфічна-тэматычнага паказальніка ўсіх матэрыялаў Скарыны і пра Скарыну. Укладаецца зборнік публіцыстычных матэрыялаў пра беларускую мову, які завершыць серыю літаратурных твораў пра нашу родную мову і ў поўным аб'ёме пакажа багацце і прыгажосць яе, ролю і значэнне ў жыцці грамадства, кожнага чалавека.

Сёлета аб'яўлены конкурс на лепшую курсавую і дыпломную працы студэнтаў на тэмы скарыніяны і гісторыі універсітэта. Акрамя таго, калектыў музея-лабараторыі распрацоўвае наступныя навуковыя праблемы: шляхі і спосабы ўдасканалення беларускай мовы як сродку мыслення, пазнання і зносін, праблемы ўдасканалення эканамічнай тэрміналогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, гімнаграфічная спадчына Ф.Скарыны. Камплектуюцца картатэкі "Вялікага руска-беларускага эканамічнага слоўніка" (гатова ўжо 300 старонак рукапісу на літары А-К), акадэмічнага "Слоўніка мовы Скарыны". Першая з названых адносіцца да прынцыпова новых у сусветным мовазнаўстве. Упершыню пастаўлена і тэарэтычна вырашаецца задача свядома, мэтанакіравана і інтэнсіўна ўдасканальваць мову як важнейшы і каштоўнейшы інструмент мыслення, пазнання і зносін, якім людзі карыстаюцца штодзённа і які арганізуе дзейнасць кожнага чалавека паасобку, прафесійных, класавых, нацыянальных груп і ўсяго чалавецтва разам.

У музеі-лабараторыі праводзяцца семінарскія і практычныя заняткі па некаторых тэмах такіх дысцыплін, як беларуская мова і яе гісторыя, беларуская літаратура, гісторыя Беларусі. Тут праходзяць пасяджэнні Савета па абароне кандыдацкіх дысертацый па мовазнаўству.

Дзейнасць музея-лабараторыі Ф.Скарыны магла б быць яшчэ больш выніковай, калі б ён меў лепшую матэрыяльную базу і неабходнае фінансаванне. Можна было б арганізоўваць часовыя выстаўкі старажытных кніг, скарынаўскія святы з удзелам пісьменнікаў, паэтаў, кампазітараў, спевакоў, мастакоў, у творчасці якіх скарынаўская тэматыка займае належнае месца. З нецярпеннем чакаем магчымасці разгарнуць сапраўдную музейную экспазіцыю, якая б нагляднымі і разнастайнымі сродкамі раскрывала жыццёвы і творчы шлях Скарыны. Гэтак жа хочацца прадставіць гісторыю універсітэта. Жыццёва неабходна заказаць копіі ўсіх карцін, скульптур, помнікаў і мемарыяльных дошак пра Скарыну, яго дзеючы друкарскі станок, касцюмы скарынаўскай эпохі і манекены людзей, атрымаць копіі і ксеракопіі ўсіх замежных і даўніх друкаваных выданняў і г.д. Каб праца не была толькі музейным набыткам, патрэбны сродкі для публікацыі навуковых распрацовак. Для павышэння выніковасці і цікавасці экскурсій патрэбны аўдыёвізуальныя сродкі. Без іх мы не можам арганізоўваць цікавыя мерапрыемствы з моладдзю і школьнікамі горада, папаўняць сваю экспазіцыю. Марым таксама пра магчымасць распрацоўваць скарынаўскую і універсітэцкую сімволіку для вытворчасці сувеніраў, паштовак, значкоў, календароў, тавараў шырокага спажывання.

**Канстанцін УСОВІЧ,**
**загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**



**Спецыяльнасць "Фізічная электроніка" — адна з маладых ва універсітэце. Трэці год на фізічным факультэце па ёй вядзецца падрыхтоўка студэнтаў са спецыялізацыяй "Медыцынская электроніка". На сённяшні дзень патрэба ў такіх кадрах на Гомельшчыне з'яўляецца вельмі актуальнай. Медыцынскія ўстановы г.Гомеля і вобласці пасля катастрофы на ЧАЭС аснашчаюцца разнастайным дыягнастычным абсталяваннем, тэхнічнае абслугоўванне якога будуць весці выпускнікі названай спецыяльнасці.**

**На здымку: пад кіраўніцтвам ст.выкладчыцы кафедры радыёфізікі і электронікі В.І.Багдановіч лабараторныя работы па курсу "Электратэхніка" выконваюць трэцякурснікі Віталь Ялагін, Валянцін Захараў і Уладзімір Карзанаў.**

**Фота М.БЯЛЬКОВІЧА.**

З гісторыі роднага краю

## ПАДАРОЖЖА Ў МІНУЎШЧЫНУ

Тураўшчына...

Што гэта за край? Чым ён адметны? Такія пытанні ўзніклі ў мяне даўно, бо даведалася я аб гэтай старонцы Беларусі яшчэ ў школе, пачуўшы гісторыю ўзнікнення першых дзяржаў на тэрыторыі нашай краіны. Зараз жа я вучуся ва універсітэце, дзе адным з галоўных прадметаў па маёй спецыяльнасці з'яўляецца старажытная літаратура. Тут у чарговы раз пачула аб Тураве.

Здаецца, кожны нешта ведае аб гэтым горадзе, а ці кожны быў там?

Наш факультэт вырашыў наведаць гэту старонку, дакрануцца да помнікаў гісторыі, адчуць дух старажытнасці і пабачыць тое месца, дзе жыў і працаваў славуты Кірыла Тураўскі.

Шлях да гэтага старажытнага горада можа здацца доўгім, але на самой справе ўсё не так, бо, праязджаючы па поўдню Беларусі, мы мелі магчымасць пабачыць шмат цікавага. У першую чаргу, гэта рэкі: Дняпро, Прыпяць, Пціч, Убарць, Ненач, Іпа... А парк? Прыгожы Прыпяцкі парк...

Калі ж мы пад'ехалі да самога горада, то былі здзіўлены тым, што такі маленькі населены пункт быў некалі сталіцай княства. Цікава было наведаць музей, які з'яўляецца скарбніцай для рэшткаў старажытнасці, і пабачыць там сапраўдны саркафаг XII ст. ці макет таго Турава, які прыгадваецца пад 980г. Пазнавальна было даведацца аб паходжанні самой назвы горада.

У Тураве захавалася Замкавая гара, тая гара, на якой некалі быў пабудаваны храм. Зараз там стаіць помнік К.Тураўскаму, чалавеку, які жыў глыбокімі думкамі, ствараючы пры гэтым каштоўныя багацці.

Такім чынам, я расказала вам аб падарожжы студэнтаў філалагічнага факультэта ў мінуўшчыну, у тыя часы, калі зараджалася ў нашай краіне дзяржаўнасць, і тыя мясціны, дзе жылі стваральнікі гісторыі.

**Аксана БАРСУКОВА,**
**студэнтка гр.БА-13 філалагічнага факультэта.**

## БУДЕМ ЗНАКОМЫ!

Почти три месяца прошло с момента, когда для студентов начался новый учебный год. У первокурсников — это время адаптации. Не секрет, что поначалу они друг с другом мало знакомы. В связи с этим в студенческом кафе общежития № 1 прошел традиционный вечер знакомства первокурсников. В этом году зал не смог вместить всех желающих принять участие в мероприятии. Для участников были приготовлены столы с различными сладостями и очень интересная развлекательная программа, над которой немало потрудились студентки IV курса филологического факультета Т.Петрунько и К.Янкова. Они же были и ведущими.

Зал время от времени заполнялся то бурными аплодисментами, когда пела А.Косинская (гр.БР-12), то дрожал от взрывов смеха, когда К.Станкевич (гр.Ф-13), Д.Подберезкин (гр.Ф-11) и Д.Сыс (гр.ФК-13) принимали участие в конкурсе "водителей".

Неравнодушными были участники и тогда, когда для первокурсников со своими миниатюрами выступал народный студенческий театр-студия "Если бы...".

И, несмотря на то, что вечер готовился для первокурсников, они сами принимали в нем непосредственное активное участие: и пели, и были артистами, и даже сочиняли частушки. Наиболее отличились Екатерина Курбан (гр.ПС-11) и Ольга Коновалова (гр.ПС-14). Ни один участник конкурсов не остался без приза или подарка.

На прощание представитель от каждого столика поделился своими впечатлениями и пожеланиями. Если их объединить, то можно сказать, что вечер знакомства удался, первокурсники остались довольными и выразили надежду, что в нашем общежитии эта традиция прижилась.

Дальнейшее знакомство первокурсники продолжили на дискотеке, которую провел А.Седой (гр.Ф-12).

От имени студентов и организаторов этого вечера хочется выразить огромную благодарность за оказанную помощь и поддержку Белорусскому Союзу Молодежи в лице Н.Г.Жукевича и В.А.Восарева, председателю профкома студентов Н.И.Колтышевой, культурному центру и отделу по воспитательной работе нашего университета.

**В.ВОРОНИНА,**
**культорганизатор общежития № 1.**

Сустрэчы

## УСПАМІНАЎ БРАТ НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА

Філалагічны факультэт у апошнія часы, на жаль, не так часта наведваюць знакамітыя людзі, таму сустрэча з Аляксандрам Усцінавічам Броўкам — родным братам вядомага беларускага пісьменніка — стала даволі значнай падзеяй.

Пачалося ўсё звычайна. Адчыніліся дзверы, і ў аўдыторыю ўвайшоў чалавек з сівымі скронямі. Мяккім голасам ён апавядаў студэнтам пра сваё нялёгкае, але цікавае жыццё. Успаміны пра далёкае дзяцінства, дарагую сэрцу сям'ю, роднае паселішча Аляксандр Усцінавіч ілюстраваў урыўкамі з твораў беларускіх пісьменнікаў.

Больш празаічнымі словамі ён прыгадваў сваю маладосць, якая прыпала на складаны час: Вялікая Айчынная вайна, сталінскія рэпрэсіі. І, нягледзячы ні на што, была сумленная праца.

Адказваючы на пытанні, Аляксандр Усцінавіч закрануў праблему ўжывання і развіцця беларускай мовы, падкрэсліў вялікую ролю фальклору ў творчасці свайго брата.

Ад імя ўсіх студэнтаў і выкладчыкаў паважанаму госцю падарылі кветкі і падзякавалі за цікавую сустрэчу.

Пасля сустрэчы ў памяць надоўга запаў светлы вобраз гэтага чалавека.

**Галіна МІГАЙ,**
**студэнтка гр.Б-42 філалагічнага факультэта.**

## О СКОРИНЕ ЯЗЫКОМ ... ФИЛАТЕЛИИ

Судя по регулярному выпуску новых почтовых марок, конвертов, карточек, этот род деятельности Министерства связи Беларуси стал не только способом получения государством дополнительных средств, но и неотъемлемой частью культуры республики. Вот почему не случайно многие филателистические материалы рассказывают об истории, науке, религии, памятниках архитектуры Беларуси, ее выдающихся людях.

Так 7 сентября 1997 года в честь 480-летия белорусского книгопечатания Министерство связи республики выпустило 4 почтовых марки, посвященных Ф.Скорине. На них изображены эпизоды (художник М.Рыжий) Виленского, Полоцкого, Пражского и Краковского периодов деятельности белорусского первопечатника, ученого, просветителя и писателя. Параллельно был изготовлен немаркированный конверт "Первый день" (художник М.Рыжий), а на Минском почтамте проводилось специальное гашение "480 гадоў Беларускага кнігадрукавання".

Жизни и деятельности Ф.Скорины несколько выпусков посвятило и Министерство связи СССР. Так в 1967 году в честь 450-летия белорусского книгопечатания был издан почтовый маркированный конверт (№ 4796) с изображением известной гравюры 1517 года. На конверте надпись: "Г.Скорина. Основоположник печатания книг на белорусском языке" (текст на русском и белорусском языках).

Минсвязи СССР отметило и 500-летие со дня рождения Ф.Скорины. В 1988 году была издана крупноформатная портретная марка, на которой также присутствует герб просветителя и условное изображение армиллярной сферы, с помощью которой Ф.Скорина, занимаясь астрономией, мог рассчитывать положение Солнца на эклиптике. 8 июня 1990 года появился маркированный почтовый конверт (художник А.Кашкуревич) с портретом Ф.Скорины. 5 сентября 1990 года на Минском почтамте проводилось специальное памятное гашение (штемпель ставился на конверте с упомянутой выше маркой).

14 июня 1990 года Минсвязи СССР выпустило почтовую карточку, на которой изображена гравюра Ф.Скорины (копия выполнена А.Фроловым). Тираж карточки составил 100000 экземпляров. Интересно, что все эти надписи на лицевой стороне выполнены только на белорусском языке.

В коллекциях филателистов есть и еще одна марка (точнее — две: в зубцовом и беззубцовом варианте), на которой показана известная гравюра. Надпись: "Беларусь. Почта" (не Пошта) и небольшой латинкой "Франциск Скарына з Полацка 1517-1917". Если верить дате, то марка должна была быть выпущена к 400-летию белорусского книгопечатания , но это ошибка. Год выпуска — 1920. История появления этих марок до сих пор не выяснена.

**Владимир ЛАРИОНОВ,**
**выпускник ГГУ им. Ф.Скорины.**

СПОРТ

### ПЕРАМОЖЦЫ СПАРТАКІЯДЫ

У Мінску прайшлі рэспубліканскія фінальныя гульні па баскетболу сярод студэнцкіх каманд у праграме спартакіяды.

У фінале сустрэліся студэнты Акадэміі фізічнага выхавання і спорту і нашага універсітэта.

Толькі ў дадатковай пяціхвілінутцы выхаванцы дацэнта Барыса Царыкава змаглі атрымаць перамогу.

### ЗДАЛІ БЫЛЫЯ ТРАДЫЦЫ

Завяршыліся спаборніцтвы па мініфутболу, якія ўпершыню праходзілі на адкрытых пляцоўках стадыёна "Прамень", дзе факультэтам даводзілася ў дзень тройчы выходзіць на пляцоўку.

У тройцы прызёраў аказаліся два факультэты тэхнічнага універсітэта імя П.Сухога і электратэхнічны - БелДУТа.

Каманда факультэта фізічнай культуры ГДУ — шматразовы пераможца спартакіяды апошніх гадоў — выступіла слаба і ў выніку аказалася на сёмым месцы.

### ТУРНІР ТЭНІСІСТАЎ

У нашым універсітэце прайшоў турнір па настольнаму тэнісу, у якім прынялі ўдзел больш 60 аматараў гэтай гульні.

Пераможцам турніру стаў другакурснік факультэта фізічнай культуры Павел Пінскі, на другім месцы — выпускнік геолага-геаграфічнага факультэта Дзмітрый Спектар і на трэцім — Наталля Цуканава — будучы эканаміст.

Турнір быў прысвечаны 56-ай гадавіне вызвалення Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а яго арганізаваў і правёў ст. выкладчык кафедры фізічнай культуры і спорту Васіль Харытошкін.

### НАДЗЕІ АПРАЎДАЛІ

У Полацку завяршыліся спаборніцтвы за Кубак Беларусі па паўэрліфтынгу (жым штангі ў стане лежачы) і першынство рэспублікі па гэтаму віду сярод юніёраў. У іх прымалі ўдзел нашы студэнты, выступаючы за зборную вобласці.

У спаборніцтвах за Кубак Беларусі студэнт факультэта фізічнай культуры майстар спорту Аляксей Марозаў (вагавая катэгорыя да 110 кг) заняў І-ае месца, перавысіўшы нарматыў "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь".

Майстар спорту міжнароднага класа Уладзімір Гадуноў (67,5 кг) стаў сярэбраным прызёрам спаборніцтваў.

Пяцікурснік матэматычнага факультэта Руслан Барадзіч (90 кг) выступаў у групе юніёраў і прывёз у Гомель бронзавую ўзнагароду рэспубліканскага першынства.

Нагадаю, што нашых асілкаў трэніруе намеснік дэкана матэматычнага факультэта па выхаваўчай і спартыўна-масавай рабоце майстар спорту Уладзімір Галавач.

### ДВОЙЧЫ МАЦНЕЙШЫЯ

У спорткомплексе ВА "Гомсельмаш" прайшлі спаборніцтвы за Кубак Гомеля па паўэрліфтынгу, у якіх прынялі ўдзел каля 60 спартсменаў.

Сярод вну прызавая тройка каманд наступная: ГДУ імя Ф.Скарыны, БелДУТ і медінстытут.

Студэнты нашага універсітэта здалі паралельны залік і за Цэнтральны раён, які і стаў пераможцам, на другім месцы — Чыгунчаны і на трэцім — Навабеліцкі.

З пераможцаў, якіх трэніруе майстар спорту Уладзімір Галавач, трэба адзначыць Уладзіміра Гадунова (вагавая катэгорыя 530 кг), Дзмітрыя Глухоткі — 545 кг, Руслана Барадзіна — 610 кг.

**В.МАРЧАНКА.**

*Мир цветов — мир прекрасного*

## И ГЛАЗ ПОРАДУЕТ, И ДУШУ ОТОГРЕЕТ



Кажется, совсем еще недавно догорели последними яркими красками клумбы, с деревьев опали последние желтые листья, а вот уже закружили в воздухе снежинки. Уменьшается выбор растений для букета.

Зимний букет — решение проблемы. Его можно сделать большим и маленьким. Природа всегда красива, в любую пору года. Нужно только "подсмотреть" оригинальные сочетания цвета, изгибы веток, форму листьев и плодов, чтобы воспроизвести это в помещении. Конечно, есть масса рекомендаций по выполнению букетов из сухого материала. Для больших помещений составляют букеты в больших керамических и напольных вазах. В них используют разнообразные соцветия злаков, засушенные особым способом ветки лиственных и хвойных пород и деревьев, до 100 и более сухих цветов роз и других растений, плодики и семена с летучками и шипами. Есть много вариантов создания картин из высушенных плоским и объемным способом цветов, листьев и других частей растений. Техника выполнения таких композиций требует специальных знаний.

Самым доступным и массовым остается скромный букетик дома или на рабочем столе в небольшой вазе. Для него используют всевозможные цветы, объединяемые общим названием "бессмертники" из-за сохраняющихся при высыхании ярко окрашенных пленок обертки соцветий: гелихризумы, акроклиниумы, аммобиумы. К ним добавляют ажурные веточки гипсофилы, кермека, колосья и метелки злаков, яркие коробочки физалиса, шиповатые плодики мордовника. Если выбор сухоцветов ограничен, можно использовать высушенные "головками" вниз летние или осенние цветы. И хотя лепестки их не сохраняют свою форму, вместе они создают "эффект массы" в глубине композиции. Пофантазировав, можно сделать "фантастические цветы", использовав в качестве лепестков части плодиков лунарии, летучие плоды деревьев, высушенные отдельно лепестки всевозможных растений. Все это не потребует много времени. Но букетик, созданный своими руками, согревает теплом лета, напоминает о событиях, с ним связанных, и отражает красоту Природы во всех ее проявлениях.

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

**Композиция, под названием "Фантастика" выполнена автором.**

**Фото В.Чистика.**

## ДАПАМОГА З-ЗА МЯЖЫ

Каталіцкі касцёл, які знаходзіцца побач з універсітэтам, не першы год праводзіць вялікую дабрачынную дзейнасць на карысць шматдзетных, маламаёмных сем'яў. Ён з'яўляецца філіялам у г.Гомелі фонду "Карытэс" рымска-каталіцкага прыходу, і гуманітарную дапамогу, якая дастаўляецца ў абласны цэнтр з-за мяжы, выдзяляе менавіта такім сем'ям.

Частка гуманітарнай дапамогі з чарговага канвою выдзелена і для нашага універсітэта.Разнастайныя дзіцячыя рэчы атрымліваюць у прафкоме тыя супрацоўнікі, хто мае ў іх асабліва вострую патрэбу— адзінокія, шматдзетныя маці, а таксама сем'і з нізкім матэрыяльным даходам.

### ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад на кафедрах:
- рускай літаратуры — дацэнта;
- матаналізу — асістэнта;
- алгебры і геаметрыі — прафесара;
- гісторыі ўсходнеславянскіх народаў — асістэнта;
- псіхалогіі — асістэнта;
- экалогіі — асістэнта;
- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту — ст.выкладчыка;
- фізвыхавання і спорту — ст.выкладчыка;
- эканомікі і кіравання вытворчасцю — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў —не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

### У ЦЭНТРЫ СУСВЕТУ — ЧАЛАВЕК

Такой была асноўная думка лекцыі "Уплыў праваслаўя на культуру", з якой у актавай зале перад студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта выступіў прафесар Маскоўскага багаслоўскага інстытута, дацэнт МДУ, кандыдат філасофскіх навук, дыякан Андрэй Кураеў. Тэма выклікала вялікую цікавасць у слухачоў, імі было зададзена шмат пытанняў, на якія яны атрымалі вычарпальныя адказы.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў факультэта фізічнай культуры, кафедра АЛФК выказваюць глыбокае спачуванне ягазагадчыку дацэнту **НАРСКІНУ** Генадзю Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ.**


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгінальнага заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 596.
Падпісана да друку 26.11.1999 г.